Суботнік з Вожыкам

## АНТОСІКІ

Мужчын прынята сёння шанаваць,
Аберагаць ад стрэсаў,
з'яў прыродных.
Апошнім часам
стала нават модным
Ў кватэры, быццам тых катоў,
трымаць.

* * *

Здавалася, зрабіў я адкрыццё!
Напраўду ж вопыт паўтарыў
ранейшы:
Глядзіш зусім іначай на жыццё,
Як робішся старэйшы і мудрэйшы.

* * *

Узрост такі — сябе я берагу,
Усё часцей звяртаюся да Бога.
Яшчэ даволі многае магу,
Але чамусь не хочацца нічога...

* * *

Хто з нас не ведае
эфекту «даміно»?
Дык ёсць яшчэ адзін —
эфект «паліцы».
Рукой зачэпіш злёгку штось адно,
І тут жа пачынае ўсё валіцца.

* * *

У бор прыйду —
там ёсць чаму здзівіцца,
Лясныя пікнікі цяпер у модзе.
Ды не магу ад думкі адчапіцца:
А ці патрэбен чалавек прыродзе?

**Антон АНІСОВІЧ,**
*Дзяржынскі раён, в. Путчына.*

Міхась МІРАНОВІЧ

**Пародыі**

## МОЙ ШЛЯХ

*Мой шлях вядзе мяне дахаты*
*Праз боль, ману, праз гвалт*
*і страты,*
*Праз здраду — жонцы і сябрам,*
*Праз сто, праз дзвесце, трыста*
*грам...*

Анатоль ДЭБІШ

Я скіраваў
Свой шлях дахаты,
Але сустрэліся
«Рабяты»...
І гэты самы
Шлях-гарэзнік
Мяне прывёў
У выцвярэзнік.

## НЮ І МЕНЮ

*Хай сабе ва ўзросце ты*
*І цана ўжо грош,*
*Зіркаеш, зайздросцячы,*
*На дзяўчат усё ж.*

Анатоль ЗЭКАЎ

Па пляжы
Што бадзяешся,
Бы па выставе
Ню?
Як есці
Не збіраешся —
То не глядзі
Ў меню!..

## Афарызмы

Жаночая здагадка больш дакладная, чым мужчынская ўпэўненасць.

*Рэд'ярд Кіплінг, англійскі пісьменнік*

Кінуць у жанчыну камень можна толькі ў адным выпадку: калі гэты камень каштоўны.

*Дон-Амінада, рускі пісьменнік*

Шчаслівы шлюб — гэта шлюб, у якім муж разумее кожнае слова, якое не сказана жонкай.

*Альфрэд Хічкок, брытанскі і амерыканскі кінарэжысёр*

Сакрэт — гэта тое, што ўсім расказваюць паасобку.

*Ванда Блоньская-Вольфарт, польская журналістка*

Здароўе — гэта калі кожны дзень баліць у іншым месцы.

*Амерыканскае выслоўе*




## Вясёлы слоўнік

Абмеркаваць — зняць меркі.
Здань — падатак.
Лянота — музычны твор.
Маскіраваць — скіраваць да мас.
Паклёпнік — бондар.
Пошчак — апляўха.
Працяжнік — цягнік.

**Даслала Ірына САСНА,**
*Жлобінскі р-н, в. Пірэвічы.*

## ДРАНІКІ ДЛЯ КУМА

Адбылося ўсё ў нядзелю.
Не прыбраўшы і пасцелі,
Згаладаўшыся з начы,
Стала дранікі пячы.
На патэльню іх паклала,
Скварак дадала нямала,
Зверху паліла смятанай —
Вось сняданак мой духмяны.
Смачна так казыча нос...
Тут кагосьці чорт прынёс.
Адчыніўшы дзверы смела,
Ледзьве, людцы, не самлела.
На парозе — мой кумок,
Няхай трасца яму ў бок!
— Добрай раніцы, кума!
Жонкі тут маёй няма?
Засланяю стол плячыма,
А ён зыркае вачыма,
Сваім носам доўгім водзіць,
Хоча дранікаў, дый годзе!
— Сабралася, кумка, есці?
Можна мне за стол прысесці?
— Не накормлены Параскай?
Ну, частуйся, калі ласка!
Я на кума пазіраю:
Мо з галоднага ён краю,
Нечаканы гэты госць?
У самога ж бульба ёсць.
Ці лянівая Параска
Мужа корміць толькі ласкай?
Дзесь бадзяецца сама,
А яго частуй кума.
Грэцца ж ноччу — ёй адной,
Не падзеліцца з кумой!
Госць патэльню змалацці
І дабаўкі папрасіў.
Кажа: «Дзякую, кума.
А больш дранікаў няма?»
— Ці ж табе патэльні мала?
Я дык не пакаштавала!
— Ці ты, кумачка, здурнела?
Думаў, ты даўно пад'ела.
Забягай да нас у госці,
Калі трэба будзе штосьці...
І падаўся на парог.
Здзекуецца, далібог!
Тут патэльню я схапіла,
Добра госця адхадзіла.
— Разабраўся ў смачнай страве,
А які ты ў іншай справе?
Хоць брыкайся, хоць гарцуй,
За сняданак адпрацуй!
...Не заходзіць болей штосьці
З той пары мой кум у госці.

**Людміла ЮШЫНА,**
*г. Гомель.*

Міхаіл УЛАСЕНКА

Я на жыццё не наракаю,
Прышчэміць, дык бяру крэдыт.
Багацце нас не распускае,
Але ўзмацняе апетыт.

* * *

Каханне часам, што прастуда:
Калі не лечыш — нейкім цудам
Раптоўна пройдзе, нібы ў сне,
І нават сэрца не кране.

* * *

Да нараканняў я глухі —
Прывычка шматгадовая.
Забыць мінулыя грахі
Дапамагаюць новыя.

* * *

Ён, мастадонт сярод пісак,
Нас павучаў падчас палемік:
Тварыць, маўляў, патрэбна так,
Каб зразумеў і акадэмік.

*г. Горкі.*

■ Гэта па-нашаму!

# Пантэон нячысцікаў у класічным інтэр'еры

## Не трэба нам усякіх замежных пакемонаў, даеш свой бестыярый!

**Пазнаёміцца са зграяй прадстаўнікоў беларускага міфалагічнага свету запрашае Гомельскі палацава-паркавы ансамбль, дзе цяпер знайшлі часовы прытулак Дамавік, Ёўнік, Злыдні, Жыцень, Шатаны, Дзедка, Лазавік і Жэўжык ды іншыя героі беларускага фальклора.**



Між тым арганізатары выстаўкі лічаць, што тых, хто заўсёды жыў і працягвае жыць дзесьці злева, трэба ведаць не толькі па апісаннях, але і ў твар. Больш за тое, у кожнага свае пастаць, нораў і звычкі, што таксама трэба мець на ўвазе. Фантазіі беларусаў пра свой міфічны свет не бяднейшыя, чым у іншых народаў. **Загадчык гомельскага філіяла Веткаўскага музея стараабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф. Шклярава Пётр ЦАЛКА** *(на фота)* усміхаецца, маўляў, нічога страшнага, што гэтыя істоты пасяліліся ў сценах палаца, дзе іх быць не павінна.

— Тут, канешне, прывіды гаспадароў палаца павінны быць. Але ж для фальклорных персанажаў стварылі ўтульныя ўмовы, у якіх яны могуць часова пажыць. Разам з веткаўскім музеем мы многа ездзім у экспедыцыі. Там дзясяткамі, а то і сотнямі чуем аповеды пра гэтых істот, частку якіх можна пабачыць на выстаўцы. У беларусаў у нашым ХХІ стагоддзі ў якую вёску ні зойдзеш, чуеш «вось я, сама бачыла...» Ці «калі не я, то матка мая казала, што бачыла». Да гэтага часу людзі ведаюць, што з дамавіком трэба дамовіцца, каб год добра прайшоў. Калі распачынаеш работу, то важна прасіць дазволу ў гаспадара памяшкання ці справы. Напрыклад, у Ёўніка ці ў Жытня.

Ёўнік, калі хто не ведае, — гэта сядзібны дух, які рупіцца, каб правільна палілася сушыльная печ, сохлі снапы і зерне, пасылае скразняк веяць збожжа, дае спору ў працы, а Жыцень дапамагае рабіць работу ў полі. Адны фалькларысты лічаць, што ён — сын Жытняй Бабы, а іншыя, што яе муж. Разабрацца ва ўсіх узаемаадносінах містычных суседзяў нашых продкаў не так проста, але магчыма.

— У Веткаўскім раёне нам расказвалі такую гісторыю, — працягвае Пётр Цалка. — Баба грабла сена і пабачыла, што ў карчах ляжыць голенькае дзіцятка і галосіць. Яна зняла з сябе спадніцу, загарнула дзіця і пайшла з ім дахаты. Па дарозе сустрэла жанчыну, якая кажа: «Дзякуй табе, што ты не пашкадавала спадніцу і сагрэла маё дзіця. Вось табе за гэта скручаны адрэз палатна. Шый колькі хочаш адзення, але адзіная ўмова: не разгортвай палатно да канца». Баба, канешне ж, умову не выканала, раскруціла палатно, і гэта прывяло да таго, што палатно скончылася. Жанчына, якая нам пра гэта распавядала, гаварыла: «Я не бачыла, а вось матка мая — так, бо пры ёй гэта адбывалася». Пра Расамаху чулі? Не пра Расамаху Бессмяротнага, героя галівудскага баевіка, а пра нашу. Аказваецца, у нас на Гомельшчыне таксама ёсць Расамаха. Але гэта жанчына. Расказваюць: «Мой дзед пойдзе сена касіць, чуе — галосіць жанчына. Сядзіць на ўзбярэжжы, калыхае дзіця і галосіць-галосіць. Гэта Расамаха. Яна патапіла сваіх дзяцей і сама ўтапілася. На той свет не бяруць яе душу. Вось сядзіць яна на беразе і галосіць».

Вядомы беларускі мастак Валерый Славук стварыў сваю галерэю каларытных ілюстрацый — выяў казачных персанажаў, характэрных менавіта для беларускіх уяўленняў пра нябачных істот. Дарэчы, яго вобразы выкарыстаслі стваральнікі праекта «LIPA. CLUB». У экспазіцыі нячысцікі набылі аб'ём — дзякуючы скульптару Антону Шыпіцы.

— Сёння вядома прыкладна 500 персанажаў беларускага міфічнага свету, але іх большасць беларусаў не ведае, — гаворыць куратар праекта Павел Арлоў. — Мяне самога дзед у дзяцінстве называў жэўжыкам. Маленькіх дзетак увогуле так часта называюць. Жэўжык — гэта вадзяны бажок, апякун рэк. Ніхто яго не можа бачыць, бо плавае ён у нябачным чоўне. Затое хутка прыходзіць на дапамогу тым, хто тоне. Жэўжыкам называюць маленькіх людзей ці проста хлапчукоў. Беларусы ў сваёй гаворцы часта ўжываюць імёны істот з беларускай міфалогіі, але не разумеюць, што гэтыя словы азначаюць. Тым больш, не ведаюць пра іх беларускі характар. Той жа Ёўнік — ён ціхі, спакойны, робіць сваю высакародную справу — сушыць, захоўвае ўраджай. Але ж, калі нехта замахваецца на ўраджай, можа і ў печку кінуць, і выгнаць з ёўні. Нашых герояў трэба папулярызаваць. Каб выстаўка была больш цікавай, мы яе рэалізуем у выглядзе адукацыйнага праект-квесту. Наведвальнікі знаёмяцца не толькі са скульптурнымі выявамі, але і з мультфільмамі і аўтарскім відэа, знятым у розных кутках Беларусі. Тут жа можна скарыстацца гарнітурай 3D-рэчаіснасці, каб літаральна з галавой нырнуць у паралельны свет.

Сам Павел Арлоў — прагрaміст ІТ-кампаніі. Гаворыць, што міфалагічным светам прадкаў захапіўся, калі стаў вывучаць гісторыю сядзібы Вялікая Ліпа ў Нясвіжскім раёне. Тады і адкрыў самабытнасць роднага фальклору. Яго мара — пасяліць паганскіх герояў у гэтай старажытнай вёсцы. А пакуль сядзіба на рэканструкцыі, калекцыя міфалагічных персанажаў вандруе па Беларусі.

— Героі, якія ёсць у нашым, беларускім фальклоры — не абстрактныя істоты, як тыя ж пакемоны, — адзначае Павел. — Між тым пакемоны сталі ўдалым камерцыйным праектам. Мікі Маўс таксама. Англічане падняліся на Гары Потэры. Сучаснае фэнтэзі вельмі папулярнае ў свеце. І нашы беларускія персанажы таксама маглі б стаць камерцыйным праектам. Урэшце ёўнікі, жэўжыкі, злыдні, шатаны і іншыя маглі б стаць каштоўнасцю не толькі культурнай спадчыны, але і прыносіць нядрэнныя грошы. Гэта могуць быць не толькі сувеніры, але і вырабы адзення з адпаведнымі вывамі, турыстычныя маршруты, камп'ютарныя гульні, кнігі... У рэалізацыі камерцыйнага праекта важна аказваецца першымі.

Між тым вартая ўвагі і ідэя ў Лельчыцкім раёне стварыць музей беларускай міфалогіі. Бо менавіта ў гэтым найпрыгажэйшым аддаленым і цяжкадаступным паўднёвым раёне Беларусі згаданыя персанажы працягваюць паўнакроўна жыць у вераваннях месцічаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*